Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 27 (515)

Не прапусціце!

НОВЫ СЕЗОН У ЖЫЦЦІ ТЭАТРАЎ

Новы сезон — гэта заўсёды магчымасць прапанаваць гледачам цікавыя творы, а таксама ўласнае іх прачытанне, арыентуючыся на сучаснага гледача. Напярэдадні 88-га тэатральнага сезона свае планы агучылі ў двух сталічных тэатрах.

Так, нядаўна адбыўся сход калектыву **Вялікага тэатра Беларусі**, які традыцыйна праводзіцца напярэдадні новага сезона. «У нас у верасні будуць прадстаўлены два новыя спектаклі — балет «Пер Гюнт» на музыку Эдварда Грыга ў пастаноўцы маладога харэографа Сяргея Мікеля і опера Джакама Пучыні «Вілісы. Фатум» рэжысёра Аксаны Волкавай. Прэм'еру новай рэдакцыі балета «Шчаўкунок» у пастаноўцы Валянціна Елізар'ева гледачы ўбачаць у кастрычніку.

У лістападзе да паказу плануецца прэм'ера оперы Шарля Гуно «Фауст» рэжысёра-пастаноўшчыка Ганны Маторнай. Юным гледачам у снежні прадставім дзіцячую оперу Глорыі Бруні «Пінокіа» (па матывах казкі Карла Калодзі) у пастаноўцы маладога рэжысёра Наталлі Бараноўскай. А вось у 2021 годзе балет «Лебядзінае возера» будзе прадстаўлены ў папярэдняй, традыцыйнай рэдакцыі Асафа Месерэра», — падзяліўся планамі мастацкі кіраўнік тэатра Валянцін Елізар'еў.

Дырэктар тэатра Яўген Пятровіч павіншаваў супрацоўнікаў з атрыманнем высокіх дзяржаўных узнагарод. У калектыве ганаровага звання «Народны артыст Беларусі» ўдастоены саліст оперы — вядучы майстар сцэны Уладзімір Громаў.

Ганаровае званне «Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь» атрымала артыстка аркестра — вядучы майстар сцэны Ларыса Ласоцкая; ганаровага звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» удастоены дырыжор Андрэй Галанаў. А вядучы майстар сцэны Аляксей Афанасьеў, дырыжор Іван Касцяхін і артыстка хору Святлана Цітова ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Акрамя гэтага, у новым сезоне ў Вялікім тэатры адбыліся і кадравыя абнаўленні: на сустрэчы прадставілі новага загадчыка трупы оперы лаўрэата міжнародных конкурсаў мецца-сапрана Наталлю Анікіну.

Таксама кіраўніцтва тэатра агучыла рашэнне, што ў верасні праводзіць дабрачынную акцыю, якая дае магчымасць бясплатна наведваць усе спектаклі людзям з абмежаванымі магчымасцямі, пенсіянерам, шматдзетным сем'ям, дзецям-сіротам, медыцынскім супрацоўнікам і студэнтам.

Наведвальнікаў **Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага** чакаюць таксама абноўленая праграма і завяршэнне рамонту на вялікай сцэне. Тут у новым сезоне плануюць пастаноўку спектакля «Браты Карамазавы» па рамане Фёдара Дастаеўскага, аднаўленне спектакля «Адзіны наследнік» па п'есе Жана-Франсуа Рэньяна (ад рэжысёра-пастаноўшчыка Вольгі Дзянісавай). Убачаць гледачы таксама мюзікл «Граф Монтэ-Крыста» ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Сяргея Кавальчыка, а Валянціна Ераньков прадставіць публіцы «Трамвай «Жаданне» па п'есе Тэнесі Уільямса. Плануе калектыў аднавіць і сваю гастрольную дзейнасць, у тым ліку ўдзел у разнастайных фестывалях. Падчас сустрэчы з калектывам Сяргей Кавальчык адзначыў, што для акцёра галоўная трыбуна — гэта сцэна, на якой ён можа і павінен несці людзям ідэалы міру, гуманізму і дабра.

Фота з сайта https://bolshoibelarus.by.

Брэнды

ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ ФЕСТЫВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Фестывальная дзейнасць у галіне культуры і мастацтва — адна з найбольш эфектыўных сацыяльна-культурных тэхналогій. Яна дазваляе рэалізаваць творчыя магчымасці, падзяліцца дасягненнямі як прафесійных, так і аматарскіх мастацкіх калектываў і асобных выканаўцаў. Але падчас прэс-канферэнцыі на тэму «Рэгіянальныя фестывалі як брэнд Беларусі. VI Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» яе ўдзельнікі прыйшлі да высновы, што мерапрыемствы такога кшталту могуць мець значна большы патэнцыял.

— Фестываль народнай мастацкай творчасці заўсёды адлюстроўвае развіцце пэўных відаў і жанраў мастацтва, характарызуецца комплексным вырашэннем мастацка-эстэтычных, навукова-метадычных і матэрыяльна-тэхнічных задач, — лічыць **начальнік аддзела метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных арганізацый Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ.**

Штогод у Беларусі праводзіцца больш за сотню фестываляў, многія з якіх ужо даўно сталі традыцыйнымі. Напрыклад, фестываль музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы», рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», «Мотальскія прысмакі» Іванаўскага раёна, міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», «Покліч Палесся» і многія іншыя. Спалучэнне традыцый і навацый у фестывальнай дзейнасці выклікае ў жыхароў рэгіёнаў цікавасць і станоўчы рэзананс. Актуальнасць і прыцягальнасць мастацкіх ідэй, пакладзеных у аснову гэтых свят, з'яўляюцца ўмовай іх укаранення ў тым ці іншым рэгіёне. У гэтых мясцовасцях фестывальныя мерапрыемствы атрымліваюць моцную грамадскую падтрымку, спрыяюць аб'яднанню намаганняў розных грамадскіх структур, скіроўваюць інтэлектуальныя, фінансавыя, кадравыя рэсурсы на вырашэнне найбольш актуальных праблем культуры ў рэгіёнах.

Спецыяліст таксама адзначыла, што, як паказвае практыка, на працягу апошніх 30 гадоў фестывальная дзейнасць заставалася адной з найбольш эффектыўных формаў захавання, развіцця і папулярызацыі народнага мастацтва. Фестывалі народна-мастацкай творчасці ў Беларусі выконваюць сваю асноўную задачу — узнаўляюцца нацыянальныя традыцыі, узбагачаецца культурнае жыццё краіны, рэгіёнаў, ствараецца максімальна шырокае поле прыцягнення як для прафесіяналаў, так і для шырокай аўдыторыі гледачоў да беларускай мастацкай культуры. Разам з тым такія мерапрыемствы дапамагаюць скіроўваць увагу дзяржавы і грамадскіх арганізацый, устаноў культуры, творчых саюзаў, дабрачынных фондаў, дзеячаў культуры і мастацтва да праблем захавання нацыянальнай культуры, эстэтычнага выхавання дзяцей, падлеткаў, моладзі на прыкладзе найлепшых узораў традыцыйнага мастацтва. У дадатак фестывальная дзейнасць спрыяе развіццю турызму.

Наглядна можна прааналізаваць сітуацыю на прыкладзе міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Ён сёлета праходзіць 29 жніўня і збярэ сваіх прыхільнікаў ужо шосты раз. Штогод у аграгарадку Лясковічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці сустракаюцца творчыя калектывы, майстры народных рамёстваў і розныя іншыя спецыялісты. Дэманструючы ўласны вопыт і наладжваючы кантакты з калегамі па цэху, наведвальнікамі, яны пашыраюць магчымасці сваёй творчай (у тым ліку і гастрольнай) дзейнасці.

— Фестываль збярэ сёлета творчыя калектывы, майстроў і рамеснікаў з васьмі раёнаў Гомельскай і трох раёнаў Брэсцкай вобласці. Варта адзначыць, што не было ніводнага фестывалю, каб да нас не прыязджалі замежныя госці, — дзеліцца **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс ЯЗЕРСКІ.** — Рэжысёрска-пастановачная група распрацавала канцэпцыю, якая дазволіць наведвальнікам пранікнуцца атмасферай прыпяцкага Палесся, атрымаць багатыя ўражанні і эмоцыі. Асаблівасцю гэтага года стала тое, што тэрыторыя, дзе праводзіцца свята, прайшла праз рэканструкцыю, і цяпер усе мерапрыемствы будуць сканцэнтраваны ў адным месцы. (Гісторыка-этнаграфічны комплекс «Музей пад адкрытым небам» з пачаткам фестывалю прыме сваіх першых наведвальнікаў. — **Аўт.**) Там будуць размешчаны і сцэнічная пляцоўка, і падвор'і, што дазволіць лягчэй арыентавацца гасцям. Наша мерапрыемства сёлета — гэта яшчэ адна яскравая турыстычная кропка на карце краіны. Паколькі тая рэканструкцыя, якую правёў Нацыянальны парк «Прыпяцкі», і той музей пад адкрытым небам, які ў нас з'явіўся, заслугоўваюць увагі наведвальнікаў.

На працягу свайго існавання «Покліч Палесся» пастаянна трансфармуецца, абрастаючы новымі традыцыямі, ідэямі і мерапрыемствамі. Так, напрыклад, сёлета ўпершыню адбудуцца канцэртна-гульнявыя выступленні аўтэнтычных калектываў і культарганізатараў «Фолькфэст» (туды прыйшло каля 50 заявак). Госці пабываюць на абсалютна розных пляцоўках, дзе будуць праводзіцца народныя гульні з далучэннем да інтэрактыўнага дзейства. Прагучаць аўтэнтычныя канцэртныя праграмы.

Вядома, не абыдзецца і без выступленняў творчых калектываў. Тут заўсёды рады бачыць гасцей і са сталіцы, і з суседніх краін. Сёлета ў мерапрыемстве возьмуць удзел калектывы — вакальны гурт «Чысты голас», нацыянальны акадэмічны Народны хор Цітовіча, ансамбль народнай музыкі «Бяседа». З Расіі чакаюць тэатр танца «Віп-пакаленне», фальклорны калектыў «Макоша» з Бранскай вобласці. Таксама арганізатарам удалося запрасіць адзін з найпапулярнейшых калектываў Украіны «Лесапетны батальён» з Івана-Франкоўскай вобласці.

Сярод навінак — правядзенне «Мазырскага эканамічнага форуму», які таксама прымуць у рамках фестывалю. На першы погляд, мерапрыемства быццам не ўпісваецца ў палітру «Поклічу Палесся», але варта паглядзець шырэй, бо такі падыход, на думку арганізатараў, дазволіць удзельнікам форуму пазнаёміцца з турыстычным, культурным патэнцыялам мясцовасці, глыбей і шырэй спазнаць Палесскі рэгіён.

Увогуле пры жаданні і ўменні бачыць магчымасці людзі знаходзяць іх і рэалізуюць задуманае. І жывуць, працуючы не дзеля чарговай галачкі «прайшло свята», а на перспектыву. Бо, напрыклад, той жа музей пад адкрытым небам — гэта тое, што дапоўніла і пашырыла інфраструктуру Нацыянальнага турыстычнага парку «Прыпяцкі». А значыць, з'явілася больш варыянтаў для адпачынку, новая лакацыя для культурных сустрэч і месца, дзе працягваюць жыць традыцыі беларускай культуры.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва npp.by.